# ПЕРАЛІК ДАКУМЕНТАЎ ДЛЯ ПАСТУПАЮЧЫХ
## на завочную форму атрымання агульнай вышэйшай адукацыі ў скарочаны тэрмін

• заява на імя кіраўніка УВА па ўстаноўленай Міністэрствам адукацыі форме (афармляецца ў лічбавым кабінеце абітурыента і непасрэдна пры падачы дакументаў);

• арыгіналы дакументаў аб адукацыі:
дыплом аб сярэдняй спецыяльнай адукацыі і дадатак да яго (для абітурыентаў, якія скончылі 9 класаў);
дыплом аб сярэдняй спецыяльнай адукацыі і дадатак да яго, а таксама дыплом аб прафесійна-тэхнічнай адукацыі і дадатак да яго (для абітурыентаў, якія скончылі 9 класаў і ўстанову прафесійна-тэхнічнай адукацыі);
дыплом аб сярэдняй спецыяльнай адукацыі і дадатак да яго, а таксама атэстат аб агульнай сярэдняй адукацыі (для абітурыентаў, якія атрымалі сярэднюю спецыяльную адукацыю на аснове агульнай сярэдняй адукацыі);

• медыцынская даведка аб стане здароўя па форме, якая ўстанаўліваецца Міністэрствам аховы здароўя;

• характарыстыка, выдадзеная ўстановай агульнай сярэдняй адукацыі або ўстановай, якая рэалізуе адукацыйныя праграмы прафесійна-тэхнічнай або сярэдняй спецыяльнай адукацыі, па форме і ў парадку, што ўстанаўліваецца Міністэрствам адукацыі (для асоб, якія атрымалі агульную сярэднюю, прафесійна-тэхнічную адукацыю або сярэднюю спецыяльную адукацыю ў 2026 годзе) па ўстаноўленай форме;

• дакументы, якія пацвярджаюць права абітурыента на льготы пры залічэнні для атрымання агульнай вышэйшай адукацыі;

• фатаздымкі 3*4 - 6 шт.

***<u>Да вышэйпералічаных дакументаў, выкананых на замежнай мове, адначасова прыкладаецца засведчаны натарыяльна іх пераклад на беларускую ці рускую мову.</u>***

Дадаткова ў прыёмную камісію пры неабходнасці прадстаўляюцца:

• заключэнне ўрачэбна-кансультацыйнай або медыка-рэабілітацыйнай экспертнай камісіі аб адсутнасці медыцынскіх супрацьпаказанняў да навучання па атрыманай спецыяльнасці і прысвойванай кваліфікацыі - для асоб з парушэннямі зроку, слыху, функцый апорна-рухальнага апарата ва ўзросце да 18 гадоў, інвалідаў I, II або III групы;

• заключэнне дзяржаўнага цэнтра карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі або даведка аб асваенні зместу адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі - для асоб з парушэннямі зроку, слыху, функцый апорна-рухальнага апарата;

• хадайніцтва адпаведнай федэрацыі (саюза, асацыяцыі) па віду (відах) спорту, уключанай у рэестр федэрацый (саюзаў, асацыяцый) па віду (відах) спорту, а пры адсутнасці такой федэрацыі (саюза, асацыяцыі) - хадайніцтва

іншай рэспубліканскай федэрацыі (саюза, асацыяцыі) па віду (відам) спорту, а таксама арыгінал і копія класіфікацыйнай кніжкі, якая пацвярджае наяўнасць не ніжэй І спартыўнага разраду, або арыгінал і копія пасведчання аб спартыўным званні "Майстар спорту Рэспублікі Беларусь міжнароднага класа" або "Майстар спорту Рэспублікі Беларусь", або даведка, якая пацвярджае спартыўныя дасягненні, выдадзеная Міністэрствам спорту і турызму або галоўным упраўленнем (упраўленнем) спорту і турызму абласнога (Мінскага гарадскога) выканкама, - для асоб, указаных у пункце 33 гэтых Правіл;

- даведка аб пацвярджэнні знаходжання ў складзе нацыянальнай або зборнай каманды Рэспублікі Беларусь па віду (відах) спорту, выдадзеная Міністэрствам спорту і турызму;
- даведка аб выніках здачы ўступных іспытаў ва ўстановах вышэйшай, сярэдняй спецыяльнай адукацыі - для асоб, якія здалі адпаведныя ўступныя іспыты ва УВА;
- іншыя дакументы, прадугледжаныя п. 13 Правіл прыёму асоб для атрымання вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі (Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 27 студзеня 2022 г. № 23).

*Прыёмная камісія мае права дадаткова запытаць у абітурыента дакументы, неабходныя для прыняцця адпаведнага рашэння, а таксама фатаздымкі абітурыента для ажыццяўлення справаводства, колькасць, від і памер якіх устанаўліваюцца УВА ў парадку прыёму ва УВА.*

Дакументы ў прыёмную камісію падаюцца абітурыентамі асабіста або іх прадстаўнікамі.

У выпадку падачы дакументаў абітурыентам дакумент, які пацвярджае асобу, прад'яўляецца ім асабіста.

У выпадку падачы дакументаў ад імя абітурыента яго законным прадстаўніком прад'яўляюцца дакументы, якія пацвярджаюць асобу і статус законнага прадстаўніка, і копія дакумента, які пацвярджае асобу абітурыента.

У выпадку падачы дакументаў ад імя абітурыента яго прадстаўніком, які дзейнічае на падставе даверанасці, прад'яўляюцца дакумент, які сведчыць асобу прадстаўніка, копія дакумента, які сведчыць асобу абітурыента, і даверанасць, засведчаная натарыяльна або ўпаўнаважанай службовай асобай.

Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 03.06.2008 № 294 (у рэдакцыі ад 16.03.2021 № 107) "Аб дакументаванні насельніцтва Рэспублікі Беларусь" устаноўлена, што дакументамі, якія сведчаць асобу, з'яўляюцца:

- пашпарт грамадзяніна Рэспублікі Беларусь;
- від на жыхарства ў Рэспубліцы Беларусь;
- пасведчанне бежанца;
- ідэнтыфікацыйная карта грамадзяніна Рэспублікі Беларусь;
- біяметрычны від на жыхарства ў Рэспубліцы Беларусь замежнага грамадзяніна;

• біяметрычны від на жыхарства ў Рэспубліцы Беларусь асобы без грамадзянства.